ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама
А.Л.Вярсоцкі
2018 г.

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх тэатральных калектываў

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх тэатральных калектываў (далей - Агляд-конкурс).
2. Мэтамі і задачамі Агляду-конкурсу з'яўляюцца: папулярызацыя і актывізацыя тэатральнага жанру ў вобласці, павышэнне ўзроўню выканальніцкага майстэрства і сцэнічнай культуры аматарскіх тэатральных калектываў, падтрымка таленавітых тэатральных калектываў, садзейнічанне стварэнню новых калектываў, знаёмству і ўмацаванню творчых сувязей паміж тэатральнымі калектывамі вобласці.
3. Арганізатарамі Агляду-конкурсу з'яўляюцца: галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, кльтуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама; ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці".
4. Агляд-конкурс праходзіць 1 раз у 2 гады (люты - верасень) у раёнах Гродзенскай вобласці па асобнаму графіку.
5. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне ўдзельнікаў Агляду-конкурсу адбываецца на свяце аматарскіх тэатральных калектываў "Несцерка запрашае" (кастрычнік).
6. У Аглядзе-конкурсе прымаюць удзел лепшыя дзіцячыя і дарослыя аматарскія тэатральныя калектывы вобласці, за выключэннем калектываў з найменнем "народны" ("узорны"), званнем "Заслужаны", якія прайшлі папярэднія адборачныя прагляды на месцах.
7. Калектывы могуць выкарыстоўваць для пастаноўкі спектакляў творы класічных і сучасных беларускіх аўтараў на беларускай ці рускай мове, п'есы замежных аўтараў.
8. Для паказу прадстаўляецца спектакль працягласцю да 60 хвілін.
9. Журы Агляду-конкурсу ўзнагароджвае дыпломамі і прызамі пераможцаў у дзвюх узроставых катэгорыях (дзіцячая і дарослая) ў

наступных намінацыях: драматычны спектакль, лялечны спектакль, музычна-драматычны спектакль, тэатральная мініяцюра, літаратурна-паэтычны спектакль.

10. Спецыяльнымі дыпломамі і прызамі ў дзвюх узроставых катэгорыях (дзіцячая і дарослая) ўзнагароджваюцца пераможцы ў наступных намінацыях: "За лепшую рэжысуру", "За лепшы акцёрскі ансамбль", "За лепшае музычнае афармленне спектакля", "За лепшую сцэнаграфію", "За ўдалы творчы эксперымент", "За лепшае сцэнічнае ўвасабленне твораў нацыянальнай драматургіі", "За лепшую жаночую ролю", "За лепшую мужчынскую ролю", "За лепшы дэбют", "За прапаганду тэатральнага жанру на сяле".

11. Астатнія калектывы - ўдзельнікі Агляду-конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел.

12. Пры падвядзенні вынікаў Агляду-конкурсу журы карыстаецца наступнымі крытэрыямі: майстэрства рэжысёра; акцёрскае майстэрства; сцэнаграфія; музычнае афармленне; культура сцэны; касцюміраванне.

13. Журы пакідае за сабой права змяняць альбо вызначаць дадатковыя намінацыі, а ў выпадку адсутнасці конкурсу ў намінацыі, аб'ядноўваць іх.

14. Пераможцы Агляду-конкурсу запрашаюцца для ўдзелу ў свяце аматарскіх тэатральных калектываў "Несцерка запрашае".

15. Лепшыя аматарскія калектывы вобласці па выніках Агляду-конкурсу будуць рэкамендаваны да прысваення наймення "народны (узорны)" і да ўдзелу ў абласным фестывалі народных тэатральных калектываў "Лідскія тэатральныя сустрэчы" і абласным фестывалі ўзорных тэатральных калектываў "Слонімскія цудадзействы".

16. Фінансаванне Агляду-конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці".

17. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: набыццё прызоў, рамак і дыпломаў.

18. Для фінансавання абласнога агляду-конкурсу аматарскіх тэатральных калектываў могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

19. Арганізатары Агляду-конкурсу захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў калектываў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

Дадатак да інструкцыі
аб парадку арганізацыі і
правядзення абласнога
агляду-конкурсу аматарскіх
тэатральных калектываў

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзігаррайвыканкама
. 2018 г.

# ЗАЯЎКА

на ўдзел у абласным аглядзе-конкурсе аматарскіх тэатральных калектываў

1. Поўная назва калектыву і базавая ўстанова дзейнасці калектыву
______________________________________________
______________________________________________
2. Прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка калектыву, пашпартныя дадзеныя (нумар, калі і кім выданы) ______________________
______________________________________________
______________________________________________
3. Колькасць дзеючых асоб у спектаклі (прозвішча, год нараджэння)
______________________________________________
______________________________________________
4. Конкурсная праграма калектыву (аўтар, назва твора)
______________________________________________
______________________________________________
5.Працягласць спектакля______________________________
6. Дата паказу спектакля______________________________
7. Адрас і кантактныя тэлефоны________________________

Подпіс кіраўніка
базавай установы культуры ______________

Заяўкі на ўдзел у аглядзе-конкурсе дасылаць да 1 лютага па адрасе:
230025, г. Гродна, ДУК "Гродзенскі АМЦНТ", вул. Савецкая, 8.
Кантактныя тэлефоны ў г. Гродна: тэл. 8 (0152) 74 36 10, мтс 5873956, тэл/факс:72 27 04,
E-mail: onmcnt@tut.by, onmcnt@mail.ru.